# Формы слова. Канчатак

**212.** Прачытайце тэкст. Выдзеленыя словы маюць адно лексічнае значэнне ці розныя? Што абазначае гэта слова?

У лесе расце прыгожая **сасна**. Да **сасны** прыхілілася бярозка. На **сасне** ў дупле знайшлі сабе прытулак вавёркі. Пад **сасной** зрабіў норку вожык.

У навальніцу злосны вецер налятае на **сасну**. Але **сасне** гэта не шкодзіць. Моцна трымаецца яна за зямлю сваім карэннем.

Выпішыце выдзеленыя словы ў слупок. Выдзеліце ў іх зменную частку знакам ☐.

Узор: *сасн[а]*
…

При змяненні слова ўтвараюцца формы гэтага ж слова, яго лексічнае значэнне не змяняецца: *рас[а]*, *рас[е]*, *рас[ы]*, *рас[ой]*; *пя[ю]*, *пя[е]*, *пя[ём]*.

**213.** Параўнайце словы ў групах. У якой групе запісаны аднакаранёвыя словы, а ў якой — формы аднаго і таго ж слова?

1. Праўда, праўдзівы, апраўдаць, апраўданне.
2. Праўда, праўдай, праўды, праўдзе.

Выпішыце аднакаранёвыя словы. Абазначце ў іх корань.


Правообладатель Национальный институт образования

**214.** Спішыце прыказкі, раскрываючы дужкі. Чаму так гавораць?

*(Праўда)* даражэйшая за грошы.
*(Праўда)* найдалей дойдзеш.
*(Праўда)* у я́му схаваеш, а сам з ямы не вылезеш.
На *(праўда)* свет стаіць.

Што вы зрабілі са словам *праўда*, каб звязаць словы прыказак паміж сабой? Выдзеліце зменную частку слова *праўда* знакам □.

Зменная частка слова, якая служыць для сувязі слоў у сказе, — гэта **канчатак.** Канчатак утварае **форму слова.**

**215.** Прачытайце. Якую добрую справу робіць хлопчык? Для чаго трэба садзіць дрэвы?



### Вішанька

Сонейка ласкавае
саграе зямлю.
Я саджу за хатаю
**вішаньку** сваю.
Будзем разам з **вішанькай**
мы цяпер расці
і сябрамі **добрымі**
будзем у жыцці.



Правообладатель Национальный институт образования

**Вішнямі** парадуе
**вішанька** мая,
ну а **добрай** справаю —
тату з мамай я.
*М. Пазнякоў.*

Якія з выдзеленых слоў з'яўляюцца формамі аднаго і таго ж слова? Выпішыце іх у два слупкі і абазначце канчаткі.

**216.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы. Змяніце, калі неабходна, канчаткі ў словах.

На, дрэва, галінка, сеў, прыгожая, матылёк.
Яго, у, былі, шырокі, крылы.
Яны, на, пераліваліся, сонейка.

Ці можна назваць гэтыя сказы тэкстам? Дакажыце.

**217.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

**Жук** пытаецца ў **жука**:
— Ты чаму без **пінжака**?
— Я памыў свой **пінжачок**
і павесіў на сучок.
*Н. Галіноўская.*

Спішыце. Якія з выдзеленых слоў з'яўляюцца формамі аднаго і таго ж слова? Абазначце ў іх канчаткі.

Якія з выдзеленых слоў з'яўляюцца аднакаранёвымі? Абазначце ў іх корань.



Правообладатель Национальный институт образования

**218.** Прачытайце. Змяніце сказы па ўзоры і запішыце. У чым падабенства і адрозненне кожнай пары сказаў?

Шуміць жытнёвае поле. — Шумяць жытнёвыя палі.
Зелянее маладая бяроза. — ...
Танцуе маленькая дзяўчынка. — ...

Выдзеліце канчаткі ў словах.

**219.** Вусна складзіце па падказках алгарытм вызначэння канчатка ў слове *дрэва*.

1. Змяняем ... .

*Дрэва — дрэвы, дрэву, дрэвам, па дрэве.*

2. Знаходзім у формах слова ... .

*Дрэва, дрэвы, дрэву, дрэвам, па дрэве.*

3. Абазначаем ... .

*Дрэва.*

**220.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Добр**ая** слав**а** людз**ей** збіра**е**, дрэнн**ая** — разганя**е**.
Добрая слава даражэйшая за багацце.

Дакажыце, што ў словах першай прыказкі выдзелены канчаткі.



Правообладатель Национальный институт образования

Запішыце другую прыказку па памяці. Выдзеліце канчаткі ў словах. Ці змаглі вы выдзеліць канчатак у прыназоўніку? Чаму?

**Прыназоўнікі не маюць канчаткаў, таму што яны не змяняюцца.**

**221.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы. Змяніце, калі неабходна, канчаткі ў словах. Выдзеліце канчаткі ў тых словах, якія змянілі.

Прыгравае, сонейка, майскі.
Свішчуць, на, бярозы, шпакі.
Раптам, загучалі, трэлі, прыгожыя, птушыныя.
Гэта, заспявала, жаваранкі.
Цудоўны, пакацілася, мелодыя, за, узлесак.

Ці можна назваць гэтыя сказы тэкстам? Дакажыце.

**222.** Знайдзіце ў кожнай групе слоў лішняе. Што аб'ядноўвае астатнія словы ў кожнай групе? Запішыце гэтыя словы.

1. Прыгожы, прыгожая, прыгажуня, прыгожыя.
2. Колас, каласок, каласіцца, каласы.
3. Ходзіць, ходзяць, ходзіш, паходка.
4. Птушаня, птушкі, птушка, птушкам.

Абазначце корань у аднакаранёвых словах. Выдзеліце канчаткі ў формах аднаго і таго ж слова.



Правообладатель Национальный институт образования

**223.** Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Вылучыце канчаткі ў розных формах слоў *гняздо*, *павуцінне*.

Чыжыкі надавалі шмат увагі *(гняздо)*. Яны вілі яго на самай высокай яліне. Гаспадар прыносіў у дзюбе сухія галінкі, мох, *(павуцінне)*. Чыжыха мацавала пруткі *(павуцінне)*, выкладала *(гняздо)* усярэдзіне пухам. Хутка ў *(гняздо)* з'явіліся яечкі.

❖ Знайдзіце ў тэксце словы, аднакаранёвыя да слова *чыж*. Выдзеліце ў іх корань.

**224.** Назавіце прадмет на малюнку. Колькі складоў у слове *пенал*? На які склад падае націск? Якая літара пішацца ў першым складзе перад націскам?



У Андрэйкі ёсць прыгожы … .
У … ляжаць ручкі, алоўкі, фламастары.
Хлопчык ніколі не ходзіць у школу без … .
Сябры захапляюцца незвычайным … Андрэйкі.

**пена́л**

Дапоўніце сказы слоўнікавым словам у патрэбнай форме і запішыце іх. Выдзеліце канчаткі ў розных формах гэтага слова. У якой форме слова вы не ўбачылі канчатка?



Правообладатель Национальный институт образования

**У некаторых формах слова канчатак можа не перадавацца гукамі (літарамі). Такі канчатак называецца нулявым і выдзяляецца знакам □: *пенал*□, *аловак*□, *пэндзаль*□.**

**225.** Прачытайце скорагаворку. Што пераблытаў аўтар?

На бярозе рак,
у рачулцы грак,
пад канапай крот,
а ў норцы кот.
*Н. Галіноўская.*

Запішыце сказ, расставіўшы на месцы словы. Выдзеліце канчаткі ў словах скорагаворкі. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

Назавіце пары слоў, якія адрозніваюцца адным гукам.

**226.** Прачытайце. Вызначце, што аб'ядноўвае словы ў кожнай групе. Вусна дапоўніце кожную групу патрэбнымі словамі. Выкарыстайце словы для даведкі.

1. Пенал, аловак, сшытак, ..., ... .
2. Кнігай, кнігу, кнізе, ..., ... .
3. Клас, класны, аднакласнік, ..., ... .

Словы для даведкі: *аднакласніца, ручка, кніга, пэндзаль, кнігі, пазакласны.*



Правообладатель Национальный институт образования

**227.** Прачытайце верш. Як ён падказвае паслядоўнасць колераў вясёлкі?

## Колеры вясёлкі

Каб вясёлку скласці з літар,
выбірае словы Наста:
**ч**араўніца,
**а**рка,
**ж**ыта,
**з**амак,
**б**эз,
**с**іроп,
**ф**ламастар.

*А. Зэкаў.*




Выпішыце словы з выдзеленымі літарамі ў два слупкі: у адзін — словы з нулявым канчаткам, у другі — усе астатнія. Выдзеліце канчаткі ў словах.

### Творчая хвілінка

Запомніце верш з практыкавання 227. Прыдумайце свой набор слоў з нулявым канчаткам, якія падкажуць паслядоўнасць колераў вясёлкі (напрыклад: *чыж, арол, жаўрук, зімародак, бусел, страус, фазан*).

**228.** Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Выдзеліце канчаткі слоў, якія стаялі ў дужках.

## Шпакоўні

У майстэрні прыемна пахла *(свежае)* пілаві́ннем. Дзед з *(Васілёк)* выраблялі шпакоўні. Да


Правообладатель Национальный институт образования

*(вечар)* яны зрабілі тры домікі для птушак. Васілёк павесіў *(шпакоўня)* у садзе на грушах.

Аднойчы *(сонечная)* раніцай у *(сад)* прыляцелі шпакі. Яны *(аблюбава́ла)* домікі на грушах. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

**пілаві́нне** — апілкі
**аблюбава́ць** — выбраць сабе што-небудзь па густу, па жаданні

Знайдзіце аднакаранёвыя словы ў тэксце. Выдзеліце ў іх корань.

❖ Знайдзіце ў апавяданні формы аднаго і таго ж слова. Выдзеліце ў іх канчаткі.

**229.** Прачытайце. У якіх групах запісаны формы аднаго і таго ж слова? Якія словы запісаны ў астатніх групах?

1. Сяброўства, сяброўка, сяброўскі, пасябраваць.
2. Сябры, сяброў, сябрам, сябрамі.
3. Маляванне, намаляваць, малюнак, размалёўка.
4. Малюнак, малюнкі, малюнкамі, малюнкаў.

Спішыце адну групу аднакаранёвых слоў на выбар. Выдзеліце ў іх корань.

Вусна падбярыце сінонімы да слова *сябры*.


Правообладатель Национальный институт образования

**230.** Прачытайце прыказкі. Пра каго так гавораць?

Іх і вада не размы**е**.
Іх і вадою не разаль**еш**.

Спішыце. Дакажыце, што ў словах выдзелены канчаткі.

Формы якога слова сустрэліся ў прыказках? Абазначце ў іх канчаткі.

**231.** Прачытайце верш. Хто можа сябраваць? Як сябруюць паміж сабой дрэвы?

### Сяброўства

Жывуць у сяброўстве дрэвы —
дуб з клёнам, бяроза з сасной.
Яны размаўляюць нібыта
брат з братам, сястра з сястрой.

Як бацька, іх дуб прыкрывае,
калі залютуюць вятры.
Такая апе́ка бывае,
калі ў добрай згодзе сябры.

*П. Прануза.*

**апе́ка** — клопат пра кагосьці

Выпішыце з верша формы аднаго і таго ж слова. Выдзеліце ў іх канчаткі.

Знайдзіце ў вершы аднакаранёвыя словы. Выпішыце іх, абазначце корань.


Правообладатель Национальный институт образования

Назавіце словы, правапіс якіх трэба правяраць. Выпішыце іх, вусна падбярыце праверачныя словы. Абазначце ў запісаных словах корань і канчатак.

Рм Прыклад якога незвычайнага сяброўства вы можаце прывесці?

Рм **232.** Разгледзьце малюнак. Які ўрок ідзе ў класе? Якая тэма ўрока? Каго намалявалі хлопчыкі? Які незвычайны малюнак атрымаўся ў дзяўчынкі?




Прачытайце пачатак тэксту.

## Такія розныя сябры

Урок малявання сёння пачаўся незвычайна. Настаўніца прапанавала вучням намаляваць сяброў...

Складзіце план будучага апавядання. Прыдумайце і запішыце свой тэкст па малюнку і прапанаваным пачатку. Карыстайцеся словамі з практыкавання 229.



Правообладатель Национальный институт образования

**233.** Прачытайце. Якія словы ў вершы ўжыты ў пераносным значэнні? Што абазначае выраз *сябраваць з алоўкамі*?

### Алоўкі

Каляровыя алоўкі
па **паперы**
**ходзяць** лоўка.
Мы з алоўкамі сябруем
і што **хочам** —
намалюем.

*Н. Сцепусь.*

Спішыце. Назавіце ў вершы формы аднаго і таго ж слова. Выдзеліце ў іх канчаткі.

❖ Абазначце корань і канчатак у выдзеленых словах.

## Слоўнікавыя словы

асцяро́жны
блішча́ць
во́блака
во́сеньскі
гарадскі́
гасці́нец
паву́к
пена́л
свяці́ць
смяя́цца
сшы́так
шча́сце



Правообладатель Национальный институт образования